МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

## IX–XI класы

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2012

УДК 373.5.091.214:3
ББК 74.266.0
В90

ISBN 978-985-559-053-9

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2012
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Грамадазнаўства» вывучаецца ў IX—XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і заклікаӯны ўнесці важкі ўклад у фарміраванне высокіх духоўных якасцей падрастаючага пакалення, садзейнічаць рэалізацыі сацыялізуючай, чалавекастваральнай і культуратворчай функцый агульнай сярэдняй адукацыі. Дадзеная вучэбная дысцыпліна з'яўляецца арганізуючым звяном сістэмы светапогляднай адукацыі навучэнцаў. Падчас вывучэння грамадазнаўства вучні засвойваюць сістэму сацыяльна-гуманітарных ведаў пра чалавека, грамадства і дзяржаву ў разнастайнасці іх узаемасувязей і ўзаемаадносін, спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін, неабходныя для паспяховай жыццядзейнасці чалавека ў грамадстве.

***Мэтай*** інтэграванага сацыяльна-гуманітарнага прадмета «Грамадазнаўства» з'яўляецца садзейнічанне станаўленню творчай асобы, якая валодае развітой свядомасцю і самасвядомасцю, здольнай на аснове асэнсавання культурна-гістарычнага вопыту, базавых каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, праблем развіцця сучаснай цывілізацыі і разумення асноўных тэндэнцый развіцця грамадства вызначыць шляхі канструктыўнай самарэалізацыі, актыўна ўключыцца ў стваральную дзейнасць.

***Задачы*** навучання грамадазнаўству заключаюцца ў тым, каб забяспечыць:

- засваенне вучнямі карціны свету, адэкватнай сучаснаму ўзроўню навуковых ведаў; асэнсаванне месца чалавека ў сучасным свеце; засваенне неабходных для гэтага ведаў пра асноўныя сферы грамадскага жыцця і чалавечай дзейнасці, іх эфектыўнае ўжыванне падчас узаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем і выканання тыповых сацыяльных роляў;

- развіццё духоўна-маральнай, прававой, палітычнай, эканамічнай, экалагічнай, эстэтычнай культуры асобы вучняў, а таксама культуры іх мыслення, зносін, працы, вучобы, вольнага часу;
- фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці, адказнай сацыяльнай пазіцыі, патрыятызму, канструктыўнага вопыту зносін, паразумення і супрацоўніцтва;
- удасканаленне агульнавучэбных уменняў і навыкаў; выпрацоўку адпаведных зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» адмысловых спосабаў дзейнасці;
- развіццё ўменняў самааналізу, самаацэнкі; падахвочванне да самаўдасканалення, павышэння культурнага ўзроўню;
- задавальненне адукацыйных запытаў асобы з улікам яе індывідуальна-ўзроставых асаблівасцей і магчымасцей праз максімальнае набліжэнне зместу вучэбнага прадмета да запатрабаванняў і інтарэсаў вучняў;
- паспяховую сацыялізацыю асобы; выпрацоўку ўстановак і перакананняў, неабходных для працягу адукацыі, актыўнага ўключэння ў працоўную дзейнасць і грамадскае жыццё.

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі «Грамадазнаўства» ўяўляе сабой вучэбны прадмет, ядро якога складае сукупнасць навуковых ведаў пра грамадства і пра чалавека. Крыніцамі канструявання зместу вучэбнага прадмета з'яўляюцца сацыяльныя і гуманітарныя навукі: антрапалогія, культуралогія, логіка, правазнаўства, паліталогія, псіхалогія, рэлігіязнаўства, сацыялогія, сацыяльная экалогія, этыка, эстэтыка, філасофія, футуралогія, эканамічная тэорыя і інш.

Змест вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» заклікаmaking забяспечыць разуменне вучнямі гуманістычнай скіраванасці сацыяльна-эканамічных працэсаў, якія адбываюцца ў беларускім грамадстве і дзяржаве, арыентацыю навучэнцаў на творча-пошукавую дзейнасць, стваральную актыўнасць, імкненне да асабістых поспехаў, якія складаюць аснову дасягненняў краіны.

Прынцыпамі адбору і пабудовы зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» з'яўляюцца:

- гуманістычная светапоглядная скіраванасць вучэбнага прадмета і яго арыентацыя на засваенне вучнямі нацыянальнай культуры ў адзінстве з дасягненнямі сусветнай культуры;
- аб’ектыўнасць і дакладнаць у асвятленні падзей і працэсаў, якія адбываюцца як у нашай краіне, так і за мяжой;
- лінейная пабудова зместу: ступеньчатасць, паслядоўнае нарошчванне і канцэнтрычнае пашырэнне аб’ёму сацыяльна-гуманітарных ведаў;
- вывучэнне ў X—XI класах раней разгледжаных дыдактычных адзінак зместу на больш высокім, праблемна-тэарэтычным узроўні;
- жыццёва-практычная і сацыяльна-культурная значнасць вывучаемага матэрыялу з улікам узроставых асаблівасцей навучэнцаў;
- інтэграцыя ведаў вучняў па аб’ектах, якія вывучаюцца, маюць вызначальнае значэнне ў разуменні сучаснага свету (чалавек, грамадства ў адзінстве яго асноўных сфер, культура).

На вывучэнне грамадазнаўства ў IX—XI класах згодна з Тыпавым вучэбным планам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца 105 гадзін (па 35 гадзін у кожным класе). У X—XI класах грамадазнаўчага кірунку (гімназіі і ліцэі) вучэбны прадмет «Грамадазнаўства» вывучаецца па дадзенай вучэбнай праграме на працягу 70 гадзін (у кожным класе). Пры вывучэнні вучэбнага прадмета ў класах грамадазнаўчага кірунку рэкамендуецца надаць больш увагі адпрацоўцы спосабаў дзейнасці, прадугледжаных вучэбнай праграмай; вывучэнню дакументаў, у якіх вызначаюцца прававыя асновы беларускага грамадства і дзяржавы, міжнародных прававых актаў; арганізацыі практычных работ з рознымі крыніцамі сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі.

Прапануецца наступны парадак вывучэння раздзелаў вучэбнай праграмы:

IX клас — «Чалавек. Грамадства. Культура»;

X клас — «Сучаснае грамадства»;

XI клас — «Беларуская дзяржава».

Змест раздзела «Чалавек. Грамадства. Культура» прадугледжвае вывучэнне вучнямі пытанняў, неабходных для паспяховай жыццядзейнасці чалавека ў грамадстве: запатрабаванні, інтарэсы, перакананні, сацыяльныя ўстаноўкі асобы; маральнае самавызначэнне асобы, роля зносін у жыцці людзей; шляхі выхаду з канфліктных сітуацый; культура чалавека і грамадства і інш.

Пры вывучэнні раздзела «Сучаснае грамадства» вучні павінны засвоіць веды пра асноўныя сферы грамадскага жыцця; сацыяльныя нормы, якія рэгулююць жыццядзейнасць грамадзяніна; веды прыкладнога характару, неабходныя для выканання асноўных сацыяльных роляў, узаемадзеяння з іншымі людзьмі і сацыяльнымі інстытутамі сучаснага грамадства.

Змест раздзела «Беларуская дзяржава» складаюць ключавыя пытанні эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага і духоўнага развіцця Рэспублікі Беларусь, яе ролі ў сучасным свеце. Надзвычай важным для выпускніка сярэдняй школы з'яўляецца вывучэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, асноўных палажэнняў ідэалогіі беларускай дзяржавы, яе эканамічнай і сацыяльнай палітыкі. Вывучэнне гэтых пытанняў накіравана на падрыхтоўку вучняў да самастойнага жыцця, іх грамадзянскае станаўленне, асэнсаванае і адказнае выкананне імі абавязкаў, прадугледжаных Асноўным законам краіны.

Змест вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» цесна звязаны з іншымі вучэбнымі прадметамі сацыяльна-гуманітарнага цыкла. Вывучэнне грамадазнаўства павінна ажыццяўляцца з улікам міжпрадметных сувязей з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі», «Беларуская літаратура», «Руская літаратура», «Геаграфія» і інш.

Падчас навучання грамадазнаўству рэкамендуецца выкарыстоўваць формы работы, якія прадугледжваюць арганізацыю актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні зместу вучэбнага прадмета: дыскусіі, семінары, канферэнцыі, эўрыстычныя гутаркі, ролевыя і дзелавыя гульні і інш.

Эфектыўнаму засваенню вучнямі дзейнаснага кампанента зместу грамадазнаўчай адукацыі будзе спрыяць сістэматычнае правядзенне ўрокаў-практыкумаў, на якіх ажыццяўляецца за-

мацаванне тэарэтычных ведаў і развіццё ўменняў ужываць іх пры рашэнні новых пазнавальных і практычных задач, праводзіць вучэбнае даследаванне, працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, публічна прадстаўляць вынікі даследчай і творчай дзейнасці. Аналіз і рашэнне вучнямі пазнавальных задач, звязаных з пэўнымі жыццёвымі сітуацыямі, дазволіць забяспечыць засваенне імі сацыяльна значных уменняў, развіццё іх творчых здольнасцей. Вучэбнай праграмай па грамадазнаўстве прадугледжана правядзенне ўрокаў-практыкумаў пры вывучэнні кожнай тэмы. Формы правядзення ўрокаў-практыкумаў могуць быць рознымі: дзелавая гульня, дэбаты, канферэнцыя, даследаванне, абарона праектаў і г. д.

# IX КЛАС

## ЧАЛАВЕК. ГРАМАДСТВА. КУЛЬТУРА

35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Праблема чалавека — ключавая праблема сучаснасці. Навукі пра чалавека і навукі пра грамадства.

### Т э м а 1. ГРАМАДСКАЯ СУТНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА (9 гадзін)

**Чалавек як асоба.** Чалавек — біясацыяльная істота. Паняцце асобы. Свядомасць і дзейнасць. Самапазнанне асобы.

**Характар і тэмперамент чалавека.** Сутнасць характару. Тыпы і рысы характару. Шляхі фарміравання характару. Тэмперамент, яго роля ў жыцці чалавека.

**Скіраванасць асобы.** Матывы. Інтарэсы і запатрабаванні. Установкі. Самавыхаванне.

**Духоўны свет чалавека.** Паняцце духоўнасці. Светапогляд, яго роля ў жыцці людзей. Шляхі развіцця духоўнага свету асобы.

**Узаемасувязь чалавека і грамадства.** Асноўныя падыходы да вывучэння грамадства. Формы ўзаемасувязі чалавека і грамадства. Сацыялізацыя асобы.

**Чалавек і гісторыя.** Сутнасць гістарычнага працэсу. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Удзельнікі гістарычнага працэсу. Роля асобы ў гісторыі.

**Рэальны гуманізм.** Ідэя гуманізму. Асноўныя палажэнні ідэалогіі беларускай дзяржавы. Сацыяльная арыентаванасць беларускай эканомікі.

**Практыкум.** Мысліцелі мінулага і сучаснасці пра чалавека і грамадства.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** гуманізм, дзейнасць, духоўнасць, гістарычны працэс, ідэалогія беларускай дзяржавы, асоба, светапогляд, грамадства, грамадска-эканамічная фармацыя, свядомасць, сацыялізацыя, тэмперамент, характар, цывілізацыя.

### Т э м а 2. КУЛЬТУРА ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА (8 гадзін)

**Роля культуры ў жыцці грамадства.** Сутнасць культуры. Функцыі культуры. Матэрыяльная і духоўная культура.

**Грані культуры.** Элітарная і масавая культура. Народная і прафесійная культура. Субкультура і контркультура. Культура ў паўсядзённым жыцці.

**Пераемнасць у развіцці культуры.** Культура як механізм сацыяльнага наследавання. Функцыі мовы ў культуры. Культурная традыцыя.

**Творчы характар культуры.** Паняцце творчасці. Асаблівасці культуратворчасці ў навуцы, мастацтве, тэхніцы. Творчасць і геніяльнасць.

**Дыялог культур.** Нацыянальнае і агульначалавечае ў культуры. Асаблівасці культуры ўсходнеславянскіх народаў. Беларусь на перакрыжаванні культур. Менталітэт беларускага народа.

**Засваенне чалавекам культуры.** Уваходжанне чалавека ў свет культуры. Сям'я як носьбіт культурных традыцый і каштоўнасцей. Школа як з'ява культуры.

**Практыкум.** Чалавек у свеце культуры.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** духоўная культура, контркультура, культура, масавая культура, матэрыяльная культура, менталітэт, субкультура, традыцыя, творчасць, элітарная культура.

### Т э м а 3. МІЖАСОБАСНЫЯ ЗНОСІНЫ (8 гадзін)

**Роля зносін у жыцці людзей.** Зносіны і іх функцыі. Віды і формы зносін. Сродкі зносін.

**Узаемадзеянне з людзьмі.** Успрыманне і разуменне людзьмі адзін аднаго. Спосабы ўзаемадзеяння. Ролевае ўзаемадзеянне.

**Зносіны ў малых групах.** Віды зносін у групах. Групы і калектывы. Лідарства і кіраўніцтва.

**Сацыяльная арыентацыя асобы.** Эгаізм і альтруізм. Індывідуалізм і калектывізм. Канфармізм і нонканфармізм.

**Канфліктныя і бесканфліктныя паводзіны.** Тыпы канфліктаў. Лініі паводзін у канфліктных сітуацыях. Шляхі вырашэння канфліктаў.

**Культура зносін.** Этыкет. Рытуалы і звычаі. Беларускія нацыянальныя традыцыі зносін.

**Практыкум.** Сучасны этыкет і культура зносін.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** альтруізм, індывідуалізм, калектывізм, канфармізм, канфлікт, этыкет, рытуал, звычай, зносіны, эгаізм, сацыяльная роля.

## Тэма 4. ЧАЛАВЕК І МАРАЛЬНАСЦЬ
(7 гадзін)

**Асноўныя паняцці маралі.** Сутнасць маралі. Дабро і зло. Абавязак. Сумленне як рэгулятар паводзін асобы.

**Маральныя каштоўнасці.** Віды маральных каштоўнасцей. Сэнс жыцця. Воля. Шчасце.

**Маральныя нормы.** Узнікненне маральных нормаў. Значэнне маральных нормаў для грамадства і чалавека. Узаемасувязь маральных нормаў, якасцей, прынцыпаў, ідэалаў.

**Маральныя адносіны.** Адносіны да іншых людзей і самога сябе. Адносіны да Радзімы. Гуманізацыя грамадскіх адносін.

**Маральныя паводзіны.** Маральны ўчынак і яго матывы. Маральная ацэнка. «Залатое правіла» маральнасці.

**Практыкум.** Пошук чалавекам мэты і сэнсу жыцця.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** ідэал, мараль, абавязак, нацыяналізм, маральная норма, патрыятызм, сумленне, каштоўнасць.

**Заключэнне** (1 гадзіна)

**Падчас вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» вучні IX класа павінны засвоіць наступныя спосабы дзейнасці:**

даваць азначэнні паняццяў на аснове вылучэння іх істотных прыкмет;

характарызаваць сацыяльныя з'явы і працэсы, тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі;

параўноўваць сацыяльныя з'явы і працэсы, вылучаць агульнае і асаблівае;

абагульняць вывучаныя сацыяльныя з'явы і працэсы, фармуляваць высновы;

канкрэтызаваць паняцці, тэарэтычныя палажэнні, высновы прыкладамі;

ацэньваць сацыяльныя з'явы і працэсы на аснове засвоеных ведаў;

ажыццяўляць пошук сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў розных крыніцах, аналізаваць і інтэрпрэтаваць яе;

ацэньваць розныя меркаванні пра сацыяльныя з'явы і працэсы;

фармуляваць і аргументаваць уласныя меркаванні па вызначаных сацыяльных праблемах;

выбіраць і абгрунтоўваць уласную лінію паводзін на аснове засвоеных ведаў;

структураваць вучэбны матэрыял, складаць разгорнуты план адказу на пытанне;

выконваць творчыя работы (эсэ, рэферат і інш.).

## Літаратура для настаўніка

*Асмолов, А.* Психология личности: учеб. пособие / А. Асмолов. — М., 2002.

Большой психологический словарь / под ред. Б. Г. Мещерякова, В. П. Зинченко. — СПб.; М., 2004.

*Высоцкий, А.* Личность в XXI веке / А. Высоцкий // Белорусская мысль. — 2007. — № 9.

*Гуревич, П. С.* Культурология: учеб. пособие / П. С. Гуревич. — М., 2003.

*Гуревич, П. С.* Философская антропология / П. С. Гуревич. — М., 2001.

*Ионин, Л. Г.* Социология культуры / Л. Г. Ионин. — М., 1996.

*Коптева, С. И.* Познай себя: Актуальные проблемы психологии самосознания / С. И. Коптева, А. П. Лобанов. — Минск, 2001.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. — Мінск, 2000.

*Лаптенок, С. Д.* Этика и этикет: учеб.-метод. пособие для учителей / С. Д. Лаптенок. — М., 1998.

*Ліцвінка, В. Д.* Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцвінка. — Мінск, 1997.

*Мясищев, В.* Психология отношений: учеб. пособие / В. Мясищев. — М., 1995.

*Осипова, Е.* Конфликты и методы их преодоления (социально-психологический тренинг) / Е. Осипова, Е. Чуменко. — Минск, 2007.

*Пономаренко, Л. П.* Основы психологии для старшеклассников: пособие для педагога / Л. П. Пономаренко, Р. В. Белоусова. — М., 2001.

Прикладная конфликтология: хрестоматия / сост. К. В. Сельченок. — Минск, 2001.

*Рогов, Е. И.* Психология общения / Е. И. Рогов. — М., 2001.

*Семенов, Ю. И.* Философия истории / Ю. И. Семенов. — М., 2003.

*Сермяжко, Е. И.* Семейная педагогика в вопросах и ответах: пособие / Е. И. Сермяжко. — Могилев, 2001.

*Смагина, Л. И.* Права ребенка: Теория и методика: пособие для педагогов / Л. И. Смагина. — Минск, 2001.

Социология молодежи / под ред. В. Н. Кузнецова. — М., 2005.

*Тойнби, Д.* Постижение истории / Д. Тойнби. — М., 1996.

*Чечет, В. В.* Педагогика семейного воспитания / В. В. Чечет. — Минск, 1998.

*Шадриков, В. Д.* Введение в психологию / В. Д. Шадриков. — М., 2002.

*Шпенглер, О.* Закат Европы / О. Шпенглер. — М., 1993.

*Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. — М., 1991.

## Літаратура для навучэнцаў

Введение в обществознание: 8—9 кл.: учеб. пособие / под ред. Л. Н. Боголюбова. — М., 2005.

*Волков, Ю. Г.* Человек: энцикл. словарь / Ю. Г. Волков. — М., 2002.

*Волкова, Е. В.* Этика: учеб. пособие для 10—11 кл. / Е. В. Волкова. — М., 2008.

*Гуревич, П. С.* Человек: 9 кл.: пособие для общеобразоват. учеб. заведений / П. С. Гуревич. — 2-е изд. — М., 1997.

*Кравченко, А. И.* Обществознание: учеб. для 9 кл. общеобразоват. учреждений / А. И. Кравченко. — 5-е изд. — М., 2006.

Культурология в вопросах и ответах / под ред. проф. Г. В. Драча. — М., 2002.

Обществоведение: учеб. пособие для 9 кл. / М. И. Вишневский [и др.]; под ред. М. И. Вишневского. — Минск: Адукацыя і выхаванне, 2009. — 208 с.

Обществознание: учеб. пособие для 8—9 кл. / под ред. Л. Н. Боголюбова. — 12-е изд. — М., 2007.

Общество: энцикл. для детей. Т. 21. Ч. 2: Культуры мира (+ CD-ROM). — М., 2008.

*Пономаренко, Л. П.* Психология для старшеклассников. Ч. 2: Психология общения / Л. П. Пономаренко. — М., 2002.

*Прощицкая, Е. Н.* Мое профессиональное будущее: учеб. пособие для 10-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Е. Н. Прощицкая. — Минск, 2007.

*Сизанов, А. Н.* Познай себя: Тесты, задания, тренинги, консультации / А. Н. Сизанов. — Минск, 2001.

Человек: Мыслители прошлого и настоящего о его жизни, смерти и бессмертии. Древний мир — эпоха Просвещения / сост. П. С. Гуревич. — М., 1991.

Человек: Мыслители прошлого и настоящего о его жизни, смерти и бессмертии. XIX век / сост. П. С. Гуревич. — М., 1995.

Человек. Общество. Государство: учеб. пособие для 8 кл. общеобразоват. школ с рус. яз. обучения: в 4 кн. / Е. В. Беляева [и др.]; под ред. Ю. А. Харина. — Кн. 1: Мой мир. — Минск, 1999.

Человек. Общество. Государство: учеб. пособие для 9 кл. общеобразоват. школ с рус. яз. обучения: в 4 кн. / Е. В. Беляева [и др.]; под ред. Ю. А. Харина. — Кн. 2: Мир людей. — Минск, 2001.

Человек: энцикл. для детей. Т. 18. Ч. 1: Происхождение и природа человека. Как работает тело. Искусство быть здоровым. — М., 2001.

Человек: энцикл. для детей. Т. 18. Ч. 2: Архитектура души. Психология личности. Мир взаимоотношений. Психотерапия. — М., 2002.

Человек: энцикл. для детей. Т. 18. Ч. 3: Духовный мир человека. — М., 2004.

# X КЛАС

## СУЧАСНАЕ ГРАМАДСТВА

35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час
*70 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час*[1]

**Уводзіны** (1 гадзіна, *2 гадзіны*)

Асаблівасці пазнання грамадскага жыцця. Асноўныя сферы жыцця грамадства.

### Т э м а 1. САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА ГРАМАДСТВА
(8 гадзін, *16 гадзін*)

**Сацыяльная арганізацыя грамадства.** Паняцце сацыяльнай структуры. Сацыяльная дыферэнцыяцыя. Сацыяльныя групы. Класы. Сацыяльныя пласты.

**Сацыяльныя адносіны і інстытуты.** Сацыяльнае дзеянне. Сацыяльныя адносіны. Сацыяльныя інстытуты.

**Нацыі і нацыянальныя адносіны.** Этнічныя супольнасці. Развіццё нацый і нацыянальных адносін. Нацыянальная самасвядомасць. Міжнацыянальныя канфлікты і шляхі іх пераадолення.

**Сям'я ў сучасным грамадстве.** Сям'я і шлюб. Структура сям'і. Функцыі сям'і. Сувязь пакаленняў. Сучасныя тэндэнцыі развіцця сям'і.

**Дэмаграфічныя працэсы.** Дэмаграфічная структура грамадства і яе дынаміка. Праблемы міграцыі насельніцтва. Шляхі рашэння дэмаграфічных праблем сучаснага грамадства.

---

[1] Курсівам пазначана колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета (тэмы) у класах грамадазнаўчага кірунку (гімназіі і ліцэі).

**Моладзь у сучасным грамадстве.** Сацыяльная характарыстыка моладзі. Маладзёжная субкультура. Сацыяльная мабільнасць моладзі.

**Практыкум.** Чалавек у сацыяльнай структуры грамадства.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** класы, нацыя, сям'я, сацыяльная група, сацыяльная мабільнасць, сацыяльнае дзеянне, страта, сацыяльны інстытут, этнас.

## Тэма 2. ЭКАНАМІЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ГРАМАДСТВА
(8 гадзін, *16 гадзін*)

**Роля эканомікі ў жыцці грамадства.** Паняцце эканомікі. Эканамічны цыкл і яго фазы. Вытворчасць і яго формы. Эканамічныя запатрабаванні і рэсурсы.

**Грошы.** Сутнасць грошай і іх віды. Асноўныя функцыі грошай. Каштоўныя паперы. Інфляцыя.

**Уласнасць і прыбыткі.** Уласнасць і яе формы. Адносіны ўласнасці. Прыбытак. Пражытковы мінімум. Спажывецкі кошык.

**Эканамічная сістэма грамадства.** Паняцце эканамічнай сістэмы. Асноўныя тыпы эканамічных сістэм. Структура сучаснай эканомікі.

**Рынак і рыначная эканоміка.** Рынак, яго віды і асноўныя функцыі. Характэрныя рысы рыначнай эканомікі. Канкурэнцыя і яе віды. Менеджмент. Маркетынг.

**Дзяржава і эканоміка.** Эканамічныя функцыі дзяржавы. Падатковая сістэма. Дзяржаўны бюджэт. Крэдытна-фінансавая сістэма.

**Практыкум.** Развіццё эканамічнай думкі ў новы і найноўшы час.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** банк, дзяржаўны бюджэт, грошы, прыбытак, інфляцыя, канкурэнцыя, крэдыт, маркетынг, менеджмент, падаткі, вытворчасць, прадукцыйныя сілы, пражытковы мінімум, спажывецкі кошык, рынак, рыначная эканоміка, уласнасць, тавар, каштоўныя паперы, эканоміка, эканамічная сістэма.

## Т э м а 3. ПАЛІТЫКА-ПРАВАВАЯ СФЕРА ЖЫЦЦЯ ГРАМАДСТВА
(8 гадзін, *16 гадзін*)

**Палітычная сістэма грамадства.** Палітыка і ўлада. Палітычная сістэма: паняцце, тыпы, функцыі. Носьбіты палітычнай улады ў грамадстве. Палітычная ідэалогія.

**Дзяржава.** Асноўныя прыкметы дзяржавы. Функцыі дзяржавы. Тыпы і формы дзяржавы.

**Дэмакратычнае грамадства.** Асноўныя прыкметы дэмакратычнага ладу грамадства. Парламентарызм як форма прадстаўнічай дэмакратыі. Прававая дзяржава і грамадзянскае грамадства. Правы чалавека.

**Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні.** Палітычныя партыі: іх функцыі і тыпы. Партыйная сістэма і яе віды. Грамадскія аб'яднанні. Маладзёжныя грамадскія арганізацыі і рухі.

**Прававыя асновы грамадства.** Права і яго асноўныя функцыі. Права і мараль. Асноўныя крыніцы права. Галіны права. Прававая культура асобы.

**Асоба і палітыка.** Палітычны статус асобы. Прававы статус асобы ў сучаснай дзяржаве. Абавязкі і грамадзянскі абавязак чалавека. Гонар і годнасць асобы. Палітычная культура асобы. Палітычнае лідарства.

**Практыкум.** Мысліцелі мінулага і сучаснасці пра палітыку, дзяржаву і права.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** улада, дзяржава, грамадзянскае грамадства, дэмакратыя, канфедэрацыя, манархія, парламентарызм, палітыка, палітычная ідэалогія, палітычная партыя, палітычная сістэма, права, прававая дзяржава, рэспубліка, унітарная дзяржава, федэрацыя.

## Т э м а 4. ДУХОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ ГРАМАДСТВА
(8 гадзін, *16 гадзін*)

**Адукацыя.** Сутнасць адукацыі. Адукацыя як сацыяльны інстытут. Беларуская сістэма адукацыі: традыцыі і сучаснасць.

**Навука.** Асаблівасці навуковага пазнання. Роля навукі ў жыцці грамадства. Асноўныя этапы развіцця навукі. Узае-

масувязь сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук. Навукова-тэхнічны прагрэс.

**Рэлігія.** Рэлігія як форма светапогляду. Структура і функцыі рэлігіі. Віды рэлігій. Верацярпімасць і свабода сумлення.

**Філасофія.** Адметныя асаблівасці філасофскага светапогляду. Сацыяльна-гістарычная абумоўленасць філасофскіх вучэнняў. Асноўныя праблемы філасофіі. Роля філасофіі ў духоўным жыцці грамадства і асобы.

**Мастацтва.** Сутнасць і віды мастацтва. Уздзеянне мастацтва на духоўны свет чалавека. Эстэтычнае стаўленне да свету. Сферы эстэтычнай дзейнасці.

**Мараль.** Грамадскія функцыі маралі. Маральная функцыя мастацтва. Узаемасувязь рэлігіі і маральнасці. Гуманістычная функцыя і маральныя асновы навукі.

**Практыкум.** Духоўныя арыенціры сучаснага грамадства.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** верацярпімасць, мастацтва, навука, адукацыя, рэлігія, свабода сумлення, філасофія, эстэтыка, эстэтычны густ.

### **Заключэнне** (1 гадзіна, *2 гадзіны*)

**Падчас вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» вучні X класа павінны засвоіць наступныя спосабы дзейнасці:**

аналізаваць вывучаемыя з'явы і працэсы: вылучаць іх прычыны, асноўныя прыкметы, наступствы;

характарызаваць сацыяльныя з'явы і працэсы; усталёўваць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі;

раскрываць сутнасць вывучаемых з'яў і працэсаў;

параўноўваць сацыяльныя з'явы і працэсы;

канкрэтызаваць паняцці, тэарэтычныя палажэнні прыкладамі;

даваць ацэнку сацыяльным з'явам і працэсам, якія вывучаюцца;

ажыццяўляць пошук сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў розных крыніцах; аналізаваць, супастаўляць і сістэматызаваць даныя з розных крыніц; выкарыстоўваць іх пры характарыстыцы сацыяльных з'яў і працэсаў;

ацэньваць розныя меркаванні пра сацыяльныя з’явы і працэсы;

фармуляваць і аргументаваць уласныя меркаванні па вызначаных сацыяльных праблемах;

выбіраць і абгрунтоўваць уласную лінію паводзін на аснове засвоеных ведаў;

аналізаваць свае дзеянні і дзеянні розных суб’ектаў, даваць ім прававую і маральную ацэнку;

прымяняць веды і ўменні пры аналізе і ацэнцы з’яў рэчаіснасці;

выкарыстоўваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры характарыстыцы вывучаемых грамадскіх з’яў і працэсаў;

структураваць вучэбны матэрыял, складаць тэзісны план;

выконваць творчыя работы (эсэ, рэфераты і інш.).

## Літаратура для настаўніка

*Авцинова, Г. И.* Социально-правовое государство: сущность, особенности становления / Г. И. Авцинова // Социально-гуманитарные знания. — 2000. — № 3.

*Бартенев, С. А.* История экономических учений в вопросах и ответах / С. А. Бартенев. — М., 2000.

*Волков, Ю. Г.* Социология: учеб. пособие / Ю. Г. Волков. — М., 2003.

Всеобщая Декларация прав человека. — Минск, 1998.

*Габрусь, І. Ф.* Духоўная сінергія: Адукацыя і асветніцтва / І. Ф. Габрусь, У. І. Міськевіч, Ю. А. Харын. — Мінск, 2002.

*Зеленов, Л. А.* Основы философии: учеб. пособие / Л. А. Зеленов. — М., 2000.

*Колесников, Ю. С.* Прикладная социология: учеб. пособие / Ю. С. Колесников. — Ростов н/Д, 2001.

*Котляр, И. И.* Права человека / И. И. Котляр. — Минск, 2005.

*Мигалатьев, А. А.* Философия государства / А. А. Мигалатьев // Социально-гуманитарные знания. — 2001. — № 6.

Общая теория государства и права: учеб. пособие / Г. А. Василевич [и др.]; под общ. ред. А. Г. Тиковенко. — Минск, 2006.

Основы права: учебник / В. Н. Артемова [и др.]; под ред. Г. Б. Шишко. — Минск, 2003.

Основы правовых знаний: пособие для учителей общеобразоват. учреждений с 12-летним сроком обучения / под ред. Г. А. Василевича. — Минск, 2007.

Политология: учеб. для вузов / под ред. проф. С. В. Решетникова. — Минск, 2005.

Права ребенка: Основные международные документы. — М., 1992.

Права человека: учеб. пособие / под общ. ред. А. Д. Гусева, Я. С. Яскевич. — Минск, 2002.

*Савицкая, Е. В.* Уроки экономики в школе: пособие для учителя: в 2 кн. / Е. В. Савицкая. — М., 2002.

*Смагина, Л. И.* Права ребенка: Теория и методика: пособие для педагогов / Л. И. Смагина. — Минск, 2001.

*Смагина, Л. И.* Сто уроков по правам ребенка: кн. для учителя / Л. И. Смагина. — Минск, 1998.

*Смоленский, М. Б.* Правоведение: учеб. пособие / М. Б. Смоленский. — Ростов н/Д, 2003.

Социология молодежи / под ред. В. Н. Кузнецова. — М., 2005.

*Старостенко, В. В.* Мифы и сакральные тексты религий мира: хрестоматия по религиоведению: учеб. пособие / авт.-сост. В. В. Старостенко. — Могилев, 2007.

*Старостенко, В. В.* Религиоведение: учебник / В. В. Старостенко. — Минск, 2008.

*Сугако, Г. Н.* Мир экономики. Макроэкономические аспекты: пособие для рук. кружков, учителей / Г. Н. Сугако. — Минск, 2002.

## Літаратура для навучэнцаў

*Баранов, П. А.* Право: 10—11 кл. Профильный уровень: учеб. для учащихся общеобразоват. учреждений / П. А. Баранов; под ред. Г. А. Бордовского. — М., 2008.

Бизнес: энцикл. для детей. Т. 26. — М., 2008.

*Васильев, В. П.* Экономика для школьников и абитуриентов: учеб. пособие / В. П. Васильев. — М., 2005.

Всеобщая Декларация прав человека. — Минск, 1998.

*Карев, Д. В.* Человек. Общество. Государство. В мире экономики (человек в системе экономических отношений) / Д. В. Карев. — Минск, 2004.

*Кравченко, А. И.* Обществознание: учеб. для 10 кл. / А. И. Кравченко. — 5-е изд. — М., 2005. — Ч. I.

Массовая культура: 10—11 кл.: учеб. пособие / А. Ю. Лазебникова [и др.]; под общ. ред. А. Ю. Лазебниковой. — М., 2008.

*Мельников, Н. К.* Основы экономики и предпринимательства / Н. К. Мельников. — Минск, 2001.

*Никитин, А. Ф.* Право и политика: учеб. пособие для 9 кл. общеобразоват. учреждений / А. Ф. Никитин. — 8-е изд. — М., 2003.

*Никитин, А. Ф.* Правоведение: учеб. для 10—11 кл. общеобразоват. учреждений / А. Ф. Никитин. — М., 2004.

Обществоведение: учеб. пособие для 10 кл. / М. И. Вишневский [и др.]; под ред. М. И. Вишневского. — Минск: Адукацыя і выхаванне, 2009. — 240 с.

Обществознание: учеб. для 10—11 кл. общеобразоват. учреждений / А. Ф. Никитин [и др.]; под ред. А. Ф. Никитина. — 3-е изд. — М., 2005.

Общество: энцикл. для детей. Т. 21. Ч. 1: Экономика и политика. — М., 2008.

Олимпиады: Человек. Общество. Государство: текстовые и тестовые задания / П. М. Гламбоцкий [и др.]. — Минск, 2008.

Человек. Общество. Государство: учеб. пособие для 10 кл. общеобразоват. школ с рус. яз. обучения: в 4 кн. / Е. В. Беляева [и др.]; под ред. Ю. А. Харина. — Кн. 3: Мир социального действия. — Минск, 2001.

Человек. Общество. Государство: учеб. пособие для 11 кл. общеобразоват. школ с рус. яз. обучения: в 4 кн. / Т. М. Алпеева [и др.]; под ред. Ю. А. Харина. — Кн. 4: Человек в мире культуры. — Минск, 2002.

# XI КЛАС

## БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАВА

35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час
*70 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час*[1]

**Уводзіны** (1 гадзіна, *2 гадзіны*)

### Т э м а 1. КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
(7 гадзін, *14 гадзін*)

**Асноўны закон дзяржавы.** Канстытуцыя і яе месца ў нацыянальнай прававой сістэме. Канстытуцыйнае развіццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — прававая аснова беларускай дзяржавы, яе ідэалогіі.

**Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь.** Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Народаўладдзе. Вяршэнства права. Суверэнітэт.

**Выбары і рэферэндумы.** Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь. Выбарчы працэс, яго асноўныя стадыі. Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.

**Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь.** Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Судовая ўлада. Мясцовае кіраванне і самакіраванне.

**Канстытуцыйныя правы і абавязкі грамадзян.** Канстытуцыя і нацыянальнае заканадаўства ў сферы абароны правоў чалавека. Асноўныя міжнародныя акты ў сферы правоў і сва-

[1] Курсівам пазначана колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета (тэмы) у класах грамадазнаўчага кірунку (гімназіі і ліцэі).

бод чалавека. Правы і свабоды чалавека ў Рэспубліцы Беларусь. Абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Практыкум.** «...Грамадзянінам быць абавязаны».

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** выбары, грамадзянства, суверэнітэт, выбарчая сістэма, мясцовае самакіраванне, Нацыянальны сход, Прэзідэнт, рэферэндум, судовая ўлада, Савет Міністраў.

### Т э м а 2. АСНОЎНЫЯ ГАЛІНЫ ПРАВА (8 гадзін, *16 гадзін*)

**Грамадзянскае права.** Сфера ўжывання грамадзянскага права. Суб'екты грамадзянска-прававых адносін. Асаблівасці Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. Грамадзянская праваздольнасць і дзеяздольнасць. Грамадзянская дзеяздольнасць непаўналетніх.

**Асновы працоўнага права.** Прававы механізм працаўладкавання. Правы і абавязкі наймальніка і работніка. Працоўны час і час адпачынку. Аплата працы і яе асаблівасці для непаўналетніх. Працоўная дысцыпліна. Парадак спынення працоўнага дагавора, пагаднення.

**Асновы адміністрацыйнага права.** Суб'екты адміністрацыйна-прававых адносін. Адміністрацыйная правіннасць. Віды адміністрацыйных спагнанняў. Акалічнасці, якія абцяжарваюць адказнасць за адміністрацыйную правіннасць.

**Асновы сямейнага права.** Заключэнне і скасаванне шлюбу. Правы і абавязкі мужа і жонкі. Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.

**Крымінальнае права.** Акалічнасці, якія выключаюць крымінальную адказнасць. Неабходная абарона. Акалічнасці, якія абцяжарваюць крымінальную адказнасць. Пакаранне, яго мэта і віды. Адказнасць непаўналетніх за крымінальныя правапарушэнні.

**Праваахоўныя органы ў Рэспубліцы Беларусь.** Пракуратура. Органы юстыцыі. Органы дзяржаўнага кантролю. Органы дзяржаўнай бяспекі. Асноўныя задачы праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь.

**Практыкум.** Моладзь і права.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** адміністрацыйнае права, грамадзянскае права, дзеяздольнасць, правапарушэнне, правадольнасць, пракуратура, сямейнае права, працоўнае права, крымінальнае права, юрыдычная адказнасць.

## Т э м а 3. ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ
(9 гадзін, *18 гадзін*)

**Сацыяльны партрэт Беларусі.** Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва краіны. Якасць і ўзровень жыцця насельніцтва. Сацыяльная абарона насельніцтва. Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

**Беларуская сацыяльна-эканамічная мадэль.** Асноўныя паказчыкі нацыянальнай эканомікі. Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка.

**Інавацыйнае развіццё краіны.** Навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. Сутнасць інавацыйнага шляху развіцця. Навуковае забеспячэнне інавацыйнага развіцця. Высокія тэхналогіі. Энергазберажэнне.

**Рэгіянальная і аграрная палітыка.** Прыярытэтныя кірункі рэгіянальнай і аграрнай палітыкі беларускай дзяржавы. Асноўныя задачы развіцця рэгіёнаў. Развіццё малых і сярэдніх гарадоў. Дзяржаўная праграма адраджэння беларускай вёскі.

**Нацыянальная і канфесійная палітыка.** Беларусь — краіна міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды. Беларускае заканадаўства ў сферы нацыянальных і канфесійных адносін. Свабода сумлення і веравызнання ў Рэспубліцы Беларусь.

**Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі.** Палітыка ў сферы культуры. Сродкі масавай інфармацыі і развіццё інфармацыйнай культуры. Палітыка ў сферы аховы здароўя. Фізічная культура і спорт.

**Маладзёжная палітыка.** Адукацыя, працаўладкаванне, занятасць, ахова здароўя — прыярытэты маладзежнай палітыкі. Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі. Роля моладзі ў ажыццяўленні палітыкі беларускай дзяржавы.

**Практыкум.** Роля моладзі ў станаўленні моцнай і квітнеючай Беларусі.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** дэмаграфічная бяспека, інавацыйнае развіццё, сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка, сацыяльныя стандарты, высокія тэхналогіі.

### Т э м а 4. БЕЛАРУСЬ У СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ
(8 гадзін, *16 гадзін*)

**Аблічча сучаснага свету.** Разнастайнасць сучаснага свету і яго супярэчнасці. Фактары разнастайнасці сучаснага свету. Сучасныя цывілізацыі. Геапалітычны статус Беларусі.

**Сістэма міжнародных адносін.** Віды міжнародных адносін. Міжнародныя арганізацыі. Міжнароднае супрацоўніцтва. Рэспубліка Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін. Нацыянальная бяспека і нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы.

**Глабальныя праблемы сучаснасці.** Вытокі глабальных праблем. Тыпы глабальных праблем. Удзел Рэспублікі Беларусь у рэалізацыі міжнародных праектаў.

**Гарызонты інфармацыйнага грамадства.** Тэхналагічныя ўклады. Канцэпцыя постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Месца Рэспублікі Беларусь у сучаснай інфармацыйнай прасторы.

**Праблемы суіснавання і ўзаемадзеяння краін і народаў.** Супярэчлівы характар наступстваў глабалізацыі. Антыглабалізм. Пазіцыя Рэспублікі Беларусь у адносінах да працэсаў глабалізацыі.

**Будучыня чалавецтва.** Сучасныя цывілізацыі і перспектывы іх развіцця. Месца і роля Беларусі ў цывілізацыйным працэсе. Задачы гуманізацыі грамадскага жыцця. Футуралагічныя прагнозы.

**Практыкум.** Стратэгічныя кірункі развіцця Рэспублікі Беларусь у XXI стагоддзі.

**Урок абагульнення.**

***Асноўныя паняцці:*** глабалізацыя, глабальныя праблемы, геапалітыка, інфармацыйнае грамадства, нацыянальная бяспека, тэхналагічны ўклад.

### **Заключэнне** (1 гадзіна, *2 гадзіны*)

**Падчас вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» вучні XI класа павінны засвоіць наступныя спосабы дзейнасці:**

аналізаваць вывучаемыя з'явы і працэсы: вылучаць іх прычыны, асноўныя прыкметы, наступствы;

раскрываць сутнасць сацыяльных з'яў і працэсаў;

характарызаваць сацыяльныя з'явы і працэсы; вызначаць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі;

даваць ацэнку сацыяльным з'явам і працэсам, якія вывучаюцца, з пазіцыі сацыяльных нормаў;

ажыццяўляць пошук сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў розных крыніцах; аналізаваць, супастаўляць, сістэматызаваць даныя з розных крыніц; выкарыстоўваць іх пры характарыстыцы сацыяльных з'яў і працэсаў;

фармуляваць і аргументаваць уласныя меркаванні па вызначаных сацыяльных праблемах;

аналізаваць свае дзеянні і дзеянні розных суб'ектаў, даваць ім прававую і маральную ацэнку;

выбіраць і абгрунтоўваць уласную лінію паводзін на аснове засвоеных ведаў;

прымяняць веды і ўменні пры аналізе і ацэнцы з'яў рэчаіснасці;

выкарыстоўваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры характарыстыцы сацыяльных з'яў і працэсаў;

параўноўваць і ацэньваць розныя пункты гледжання па актуальных праблемах развіцця сучаснага грамадства;

структураваць вучэбны матэрыял, складаць план-канспект;

выконваць заданні даследчага характару, творчыя работы (рэфераты, эсэ і інш.).

## Літаратура для настаўніка

*Василевич, Г. А.* Конституционное право Республики Беларусь: учеб. для вузов / Г. А. Василевич. — Минск, 2003.

*Василевич, Г. А.* Органы государственной власти Республики Беларусь / Г. А. Василевич. — Минск, 1999.

*Вішнеўскі, А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. — Мінск, 2003.

Идеология и молодежь Беларуси: пособие / Л. С. Аверин [и др.]; под ред. Л. Е. Землякова, С. Д. Лаптенка. — Минск, 2005.

*Кацубо, С. П.* Молодежь и закон: пособие для учителей, социальных педагогов, кл. рук., восп. / С. П. Кацубо. — Минск, 2005.

Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). — Минск, 2006.

*Котляр, И. И.* Права человека / И. И. Котляр. — Минск, 2005.

*Лукашенко, А. Г.* Исторический выбор Беларуси: лекции Президента Республики Беларусь в БГУ. Минск, 14 марта 2003 г. / А. Г. Лукашенко. — Минск, 2003.

*Мельник, В. А.* Основы идеологии белорусского государства: пособие / В. А. Мельник. — Минск, 2010.

Наш исторический выбор — независимая, сильная и процветающая Беларусь. Доклад Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на четвертом Всебелорусском народном собрании (6 декабря 2010 г.).

Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 года. — Минск, 2004.

Общая теория государства и права: учеб. пособие / Г. А. Василевич [и др.]; под общ. ред. А. Г. Тиковенко. — Минск, 2006.

Обществознание: глобальный мир в XXI веке: 11 кл.: кн. для учителя / Л. В. Поляков [и др.]; под ред. Л. В. Полякова. — М., 2007.

Основы идеологии белорусского государства: курс лекций / под общ. ред. С. Н. Князева, С. В. Решетникова. — 2-е изд. — Минск, 2005.

Основы идеологии белорусского государства: пособие для учителей учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования, с белорус. и рус. яз. обучения с 11-летним сроком обучения / Н. П. Денисюк [и др.]. — Минск, 2005.

Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / Г. А. Василевич [и др.]; под общ. ред. Г. А. Василевича, Я. С. Яскевич. — Минск, 2004.

Основы права Республики Беларусь: понятия и схемы / под ред. В. А. Круглова, Е. В. Шейпак. — Минск, 2003.

Основы права: учебник / В. Н. Артемова [и др.]; под ред. Г. Б. Шишко. — Минск, 2003.

Основы правовых знаний: пособие для учителей общеобразоват. учреждений с 12-летним сроком обучения / под ред. Г. А. Василевича. — Минск, 2007.

Первый съезд ученых Республики Беларусь (Минск, 1—2 ноября 2007): сб. материалов / редкол.: А. Н. Косинец [и др.]. — Минск, 2007.

Права человека: учеб. пособие / А. Д. Гусев [и др.]; под общ. ред. А. Д. Гусева, Я. С. Яскевич. — Минск, 2002.

*Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я. А. Юхо. — Мінск, 2003.

*Яскевич, Я. С.* Становление идеологии белорусского государства и национальная идея: Традиции и новации / Я. С. Яскевич. — Минск, 2004.

## Літаратура для навучэнцаў

Беларусь — страна твоего будущего: кн. для выпускника / авт.-сост.: Н. Г. Ванина, Н. Н. Ганущенко, В. И. Ивченков. — Минск, 2010.

*Гламбоцкий, П. М.* Человек. Общество. Государство: 11 кл. / П. М. Гламбоцкий. — Минск, 2003.

Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). — Минск, 2006.

Мир и Беларусь: аспекты устойчивого развития: пособие для учащихся ст. кл. общеобразоват. учреждений / под общ. ред. М. М. Ковалева, Т. П. Субботиной. — М., 2003.

Обществоведение: учеб. пособие для 11 кл. / М. И. Вишневский [и др.]; под ред. М. И. Вишневского. — Минск: Нар. асвета, 2010. — 270 с.

Олимпиады: Человек. Общество. Государство: текстовые и тестовые задания / П. М. Гламбоцкий [и др.]. — Минск, 2008.

Человек. Общество. Государство: учеб. пособие для 10 кл. общеобразоват. школ с рус. яз. обучения: в 4 кн. / Е. В. Беляева [и др.]; под ред. Ю. А. Харина. — Кн. 3: Мир социального действия. — Минск, 2001.

Человек. Общество. Государство: учеб. пособие для 11 кл. общеобразоват. школ с рус. яз. обучения: в 4 кн. / Т. М. Алпеева [и др.]; под ред. Ю. А. Харина. — Кн. 4: Человек в мире культуры. — Минск, 2002.

Человечество. XXI век: энцикл. для детей. Доп. том. — М., 2003.

## З м е с т

Тлумачальная запіска ................................ 3

IX КЛАС. **Чалавек. Грамадства. Культура** .... 8
X КЛАС. **Сучаснае грамадства** ..................... 14
XI КЛАС. **Беларуская дзяржава** ................. 21

Вучэбнае выданне

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

**ГРАМАДАЗНАЎСТВА**
**IX–XI класы**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. В. Дземід*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктары *К. В. Шобік, Л. А. Місінкевіч*

Падпісана ў друк 12.04.2012. Фармат 60×84/16. Папера газетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,62. Ул.-выд. арк. 1,3.
Тыраж 3200 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494469
ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"». ЛП № 02330/327 ад 19.01.2012.
Вул. Захарава, 59, 220088, г. Мінск